# СЛУЖЫЦЕ — І ВЯРТАЙЦЕСЯ!

**Па традыцыі першымі ў войска адправілася ваенная эліта — будучыя прадстаўнікі сіл спецыяльных аперацый і Мінскай ваеннай камендатуры, а таксама сухапутных войскаў. Ці настроены юнакі на вайсковую службу, карэспандэнты «Звязды» даведаліся падчас урачыстай цырымоніі адпраўкі, якая прайшла ў Мінскім гарадскім ваенным камісарыяце.**

— Самае галоўнае, што наш сын хоча служыць, — не хаваюць радасці бацькі прызыўніка Дзмітрый і Наталля Сітнікі. — Больш за тое, ён марыць стаць афіцэрам.

Усвядомленым выбарам служба ў войску з'яўляецца і для Андрэя Тушынскага. Маці юнака, Ганна Гарыеўна, якая выпраўляе сына, прызнаецца, што настрой у іх баявы. А па-іншаму і быць не можа: Андрэй будзе служыць у сілах спецыяльных аперацый. Юнак упэўнены, што зробіць усё дзеля таго, каб быць годным нашчадкам сваіх гераічных продкаў. Адзін прадзед мінчаніна, да Вялікай Айчыннай начальнік міліцыі ў Лідзе, у вайну быў сувязным партызанскага атрада на Гомельшчыне. Вядома, што яго расстралялі немцы, дзе пахаваны партызан, ніхто не ведае. Другому прадзеду Андрэя, у адрозненне ад многіх курсантаў, якія з лёгкай рукі лётчыка пасля паскораных курсаў накіроўваліся на фронт, пашчасціла дачакацца Перамогі.

Каля 10 тысяч прызыўнікоў папоўняць армейскія шэрагі гэтай вясной. Служба ў рэзерве чакае амаль тысячу грамадзян.

— Сёння ў армію ідуць самыя лепшыя прызыўнікі, юнакі, якія па сваіх маральна-псіхалагічных якасцях годна выканаюць свой воінскі абавязак, — адзначае **намеснік начальніка Галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Юрый КУЗЬМІН**. — Самае галоўнае, што ў іх ёсць жаданне служыць. Большасць з іх матываваныя для праходжання вайсковай службы на шматлікіх воінскіх пасадах. Многія ўжо цяпер выказваюць жаданне ў далейшым працягнуць службу па кантракце.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.



Не выключае такі варыянт і сённяшні навабранец Антон Аляшкевіч, якога прыйшлі праводзіць у армію тры прыгажуні — бабуля, мама і дзяўчына ***(на фота)***. Хлопец жартуе, што калі Ангеліна дачакаецца яго з войска, то абавязкова павядзе яе ў загс. Бабуля Антона лічыць, што кожны хлопец павінен адслужыць у арміі. «Толькі прайшоўшы шлях маладога байца, можна стаць сапраўдным мужчынам. Я ўвогуле люблю людзей у форме, і каб была мая воля, то і дзяўчат бы забіралі ў войска: ім гэта таксама не нашкодзіць», — перакanana Марыя Мікалаеўна, якая сама не адзін год прысвяціла арміі.

Ірына Андрэеўна, маці прызыўніка Фадзі, не можа стрымаць слёз: перажывае, што працяглы час не ўбачыць свайго сыночка. Бацька хлопца, Сулейман, супакойвае яе тым, што служба ў войску пойдзе на карысць прафесійнай дзейнасці сына. Аказваецца, Фадзі па адукацыі — фельчар, таму служба ў падраздзяленні медыцынскага забеспячэння не дазволіць яму страціць навыкі.

— Маладыя людзі, якія прыходзяць з войска, мяняюцца ў лепшы бок, — перакананы бацька прызыўніка Вячаслаў Часновіч. — Армія загартоўвае характар, волю, мужнасць.

Адпраўка ажыццяўляецца ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і вайсковыя фарміраванні. Гэтай вясной выкліку на прызыўныя камісіі падлягае каля 50 тысяч грамадзян нашай краіны. У ваенных камісарыятах завяршаецца медыцынскі агляд прызыўнікоў. Прызыўнымі камісіямі ў адносінах да грамадзян Беларусі ўжо вынесена больш як 30 тысяч рашэнняў.

Сёлета прадстаўлена звыш 20 тысяч адтэрміновак. Асноўную частку — больш як 80% — складаюць адтэрміноўкі для працягу адукацыі. Іншыя юнакі гэтай вясной не пойдуць у войска па сямейных абставінах, у сувязі са станам здароўя і набыццём ваенна-тэхнічных спецыяльнасцяў, з ажыццяўленнем дэпутацкіх паўнамоцтваў і на падставе ўказаў Прэзідэнта Беларусі.

...Бацькі, сваякі і сябры развітваюцца са сваімі прызыўнікамі. Наступны раз, падчас цырымоніі прынясення ваеннай прысягі, якая адбудзецца 10 чэрвеня, яны ўбачаць ужо вайскоўцаў, спадзяёмся, сапраўдных абаронцаў сваёй Айчыны.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Надвор'е

## Май прыпячэ?

### Сіноптыкі адзначаюць, што на выхадныя месцамі чакаецца да плюс 28 градусаў

**Сапраўды цёплае і сухое надвор'е чакаецца ў нашай краіне на гэтым тыдні, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Спецыяліст лічыць, што ўжо з серады па нядзелю на тэрыторыі Беларусі пачне гаспадарыць антыцыклон, які прынясе да нас сухое і ціхае надвор'е, калі тэмпературны фон будзе толькі павялічвацца. Аднак, сёння будзе яшчэ даволі свежа, бо ў краіну завітае атмасферны фронт, што і прынясе кароткачасовыя дажджы, а ў асобных раёнах навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 11—17 цяпла, а ў паўднёва-заходніх раёнах — да плюс 18—21 градусаў.

Антыцыклон у сераду прынясе нам кантрасную тэмпературу, калі ўначы будзе толькі 1—5 цяпла, у асобных раёнах па поўначы прагназуюцца нават замаразкі да нуля — мінус 2 градусаў. Аднак удзень чакаецца ўжо ад плюс 13 да плюс 19 градусаў, а па захадзе — да плюс 21 градуса. Будзе халаднавата і ноччу ў чацвер, калі прагназуецца толькі 2—7 цяпла, але ўдзень чакаецца ад плюс 13 да плюс 19 градусаў, па захадзе — да 22 цяпла. Тэмпература паветра ў пятніцу ўначы складзе 4—11 цяпла, удзень — ад плюс 18 да плюс 25 градусаў. Даволі сонечна і без ападкаў прагназуецца і ў суботу. Уначы будзе 6—13 цяпла, а ўдзень ад 20 да плюс 27 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у нядзелю на фоне высокага атмасфернага ціску па тэрыторыі Беларусі будзе праходзіць атмасферны фронт, які прынясе ў асобныя раёны краіны кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—14 цяпла, а ўдзень чакаецца ад плюс 18 да плюс 25 градусаў, у заходніх раёнах — да 28 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ На слыху

# ШОУ ПАВІННА ПРАЦЯГВАЦЦА, або Пяць уражанняў ад «Еўрабачання-2017»

**У мінулыя выхадныя завяршылася адно з самых маштабных і рэйтынгавых забаўляльных тэлешоу ў свеце — 62-і міжнародны песенны конкурс «Еўрабачанне». Перамогу ў ім — нечаканa пасунуўшы італьянскага фаварыта букмекераў — атрымаў прадстаўнік Партугаліі Сальвадор Сабрал, які з песняй на роднай мове «Amar Pelos Dois» («Любіць за дваіх») паставіў адразу два рэкорды. Так, па-першае, спявак усталяваў новую планку атрыманых балаў — 758. А па-другое, яго трыумфальнае выступленне — гэта першая перамога Партугаліі на конкурсе за паўстагоддзя ўдзелу!**

Нягледзячы на ашаламляльны поспех, нацыянальным героем Сальвадор Сабрал сябе не лічыць, адзначаючы жартам, што гэта меса ўжо трывала занята Крыштыяну Раналду.

На фоне Партугаліі, пагадзіцеся, Беларусі з 14-гадовай гісторыяй выступленняў на еўравізійнай сцэне скардзіцца на занятае сёлета 17-е меса ніяк не выпадае. Дый, па вялікім рахунку, і няма на што: наш гурт «NaviBand» упершыню прывёз і шырока разрэкламаваў на шоу беларускую мову, двойчы выканаў сваю песню ў прамым эфіры для шматмільённай аўдыторыі і дакладна запомніўся многім гледачам па ўсім свеце. Самі артысты на рэдкасць адэкватна, без эмацыянальных перагібаў, успрынялі свой вынік. Летам выканаўцы плануюць шмат выступаць на фестывалях і запісваць новы альбом, а з беларускай публікай абяцаюць сустрэцца ўжо 3 чэрвеня на вялікім адкрытым канцэрце каля сталічнай ратушы.

А пакуль амаль усе сёлетнія ўдзельнікі дазволілі сабе маленькія творчыя канікулы. Затое арганізатарам расслабляцца рана. Паводле слоў выканаўчага прадзюсара «Еўрабачання» Яна Ола Санда, падрыхтоўка да шоу 2018 года пачнецца ўжо на наступным тыдні, калі будуць агучаны прыкладныя даты правядзення конкурсу ў Партугаліі. Развітваючыся з чарговым яскравым шоу, нагадаем, чым яно найбольш запомнілася.

### «Дрэс-код»

Абсалютная большасць удзельнікаў сёлета выбралі для выступленняў уборы ў чорна-белай гаме, а падобных адна да адной белых празрыстых сукенкі часам выклікалі сапраўдную блытаніну. Папулярныя раней касцюмы-трансформеры выкарысталі хіба малдаване, у нумары якіх бэк-вакалісткі імкліваператвараліся ў нявест.



Фота www.eurovision.tv

**Пераможца «Еўрабачання» Сальвадор Сабрал разам са сваёй сястрой Луізай — аўтарам яго песні.**

### Інсталяцыі

Адразу некалькі краін задзейнічалі сёлета ў сваіх пастаноўках не толькі камп'ютарныя спецэфекты, але і незвычайныя дэкарацыі. У беларусаў, нагадаем, гэта быў лятучы човен. Украінскія рокеры выступалі на фоне вялізнай галавы, у якой у кульмінацыйныя моманты свяціліся пражэктары-вочы, хлопец з Аўстрыі, чымсьці нагадваючы айсберг у акіяне, выступаў у аблоках на фоне вялізнага бліскучага Месяца, дуэт з Сербіі выкаціў на сцэну дзве бутафорскія гарматы, а прадстаўнік Ірландыі спяваў сваю незвычайную калыханку на паветраным шары. Дапамаглі гэтыя рэчы далёка не ўсім, але шоу зрабілі безумоўна цікавейшым.

### Людзі і жывёлы

Італьянскі спявак Франчэска Габані, які ў сваёй песні ўпікнуў еўрапейцаў у масавай і сляпой залежнасці ад інтэрнэт-экспертаў, сацыяльных сетак, сэлфі і іншых модных штук, для найлепшага адлюстравання вобраза выбраў малпу. Але не сапраўдную — паводле правілаў «Еўрабачання», у нумарах нельга задзейнічаць жывёл, — а чалавека ў касцюме гарылы, які, здаецца, стаў адным з самых папулярных персанажаў сёлетняга конкурсу.

Канкурэнцыю яму складаў хіба што яшчэ больш дзіўны персанаж — «конь у паліто». Дакладней, зноў жа чалавек у касцюме каня, які не толькі ўпрыгожыў сцэнічную пастаноўку Азербайджана, але і прайшоў у складзе дэлегацыі па чырвонай дывановай дарожцы.

### Моўная палітра

Заклік святкаваць разнастайнасць сёлета знайшоў падтрымку ў многіх удзельнікаў — традыцыйную большасць англамоўных кампазіцый удала разбавілі не толькі нумары Італіі, Іспаніі, Францыі і Харватыі, але таксама жанравыя эксперыменты і этнічныя матывы ад Румыніі, Венгрыі, Беларусі і Партугаліі.

### Прыгоды на пятую кропку

Фінал шоу азмрочыла хуліганская выхадка — адзін з гледачоў выскачыў на сцэну падчас выступлення леташняй пераможцы Джамалы і прадэманстраваў на камеры... уласную аголеную пятую кропку. Ахоўнікі, спахапіўшыся, вывелі парушальніка — ім аказаўся ўкраінскі пранкер Васіль Сядзюк, вядомы сваімі скандальнымі выхадкамі ў дачыненні да многіх знакамітасцяў, у тым ліку спявачкі Мадонны, галівудскіх акцёраў Уіла Сміта і Леанарда Дзі Капрыа. Аматара правакацыйнай славы, натуральна, затрымалі, і яму пагражае пакаранне ад штрафу да 5 гадоў пазбаўлення волі — адна з прамога эфіру агіднага ўчынку не выйшла...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.** *tselyashuk@zviazda.by*

### МУЗЫЧНЫ АРБІТРАЖ

*Нагадаем, паводле абноўленых летась правілаў галасавання на «Еўрабачанні» нацыянальныя журы і гледачы выстаўляюць ацэнкі паасобку. На конкурсе ж агучваюцца спачатку балы ад суддзяў з кожнай краіны, а потым — сумарныя балы ад усіх гледачоў, што дадае інтрыгі ў выбары пераможцы.*

*Дарэчы, у беларускую суддзейскую калегію сёлета ўвайшлі галоўны спецыяліст аддзела канцэртна-фестывальных праектаў упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Іна Мардусевіч, спявачка і педагог па вакале Людміла Куц, прадзюсар і кампазітар Леанід Шырын, спевакі Вікторыя Алешка і Аляксей Грос.*

*У фінале нашы выканаўцы набралі 50 балаў ад журы (па 12 ад Азербайджана і Украіны, 7 ад Аўстрыі, 5 ад Харватыі, па 3 ад Грэцыі і Малдовы, па 2 ад Мальты, Балгарыі і Латвіі, па 1 ад Ізраіля і Вялікабрытаніі), і 33 ад гледачоў (8 паставіла Украіна, 6 — Грузія і Латвія, 4 — Польшча, 3 — Чэхія, 2 — Эстонія і Ізраіль, 1 — Літва і Малдова), што і прынесла выніковае 17-е месца.*